АХОВА
ПАД ЗНАКАМ САВЫ
№ 2 (18)
СУМЕСНЫ ВЫПУСК «ЗВЯЗДЫ» І ДЭПАРТАМЕНТА АХОВЫ МУС РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

„ЦЯПЕР АХОЎНАЙ ДЗЕЙНАСЦЮ СТАЛА НАЗЫВАЦЦА ТОЕ, ШТО РАНЕЙ ХАРАКТАРЫЗАВАЛАСЯ ЯК ЗАБЕСПЯЧЭННЕ БЯСПЕКІ ЮРЫДЫЧНЫХ І ФІЗІЧНЫХ АСОБАЎ.“

„КАЛІ АРГАНІЗАЦЫЯ АЖЫЦЦЯЎЛЯЕ АХОВУ ПРЫНАЛЕЖНАЙ ЁЙ МАЁМАСЦІ, ГЭТА ЗНАЧЫЦЬ, РЭАЛІЗУЕ ДАПАМОЖНЫЯ РАБОТЫ ПА АХОВЕ РУХОМАЙ І НЕРУХОМАЙ МАЁМАСЦІ, ТО ЯНА Ў ВЫЗНАЧАНЫМ ЗАКОНАМ ПАРАДКУ АБАВЯЗАНА АТРЫМАЦЬ ЛІЦЭНЗІЮ НА ГЭТА.“

Прафесіяналізм

ПАЦЯГНУЛА НА САЛОДЗЕНЬКАЕ

У адну з лютаўскіх начэй вартаўнік Скідальскага цукровага камбіната Таццяна Кумас знаходзілася на чарговым дзяжурстве. Спачатку ўсё было спакойна, аднак у хуткім часе прадпрыемства быццам «ажыло»: каля прахадной праехала некалькі легкавых аўтамабіляў, цеплавоз з саставам вагонаў пачаў рух з мэтай перастроіцца на суседнія пуці, і гэта не магло не насцярожыць жанчыну, бо было глыбока за поўнач. Таццяна паведаміла ў дзяжурную часць Кастрычніцкага (г. Гродна) аддзела аховы аб дзівосах, што адбываюцца. Інфармацыя была перададзена бліжэйшаму нараду. Якраз у гэты момант група затрымання ў складзе міліцыянера-кінолага прапаршчыка міліцыі Ігара Сарокі, міліцыянера-вадзіцеля прапаршчыка Дзмітрыя Палешука і камандзіра аддзялення старшага прапаршчыка міліцыі Станіслава Яроміча накіроўвалася для праверкі нясення службы на кантрольна-прапускным пункце чыгуначных варотаў ААТ «Скідальскі цукровы камбінат». Таму пераканацца ў дакладнасці атрыманай інфармацыі міліцыянеры змаглі літаральна праз хвіліну.

Набліжаючыся да месца, экіпаж звярнуў увагу, што ля варотаў прадпрыемства стаіць некалькі аўтамабіляў. «Аўдзі» і «Сітраен», якія належалі двум работнікам цукровага камбіната, машыністу цеплавоза і саставіцелю вагонаў, былі затрыманыя і агледжаныя супрацоўнікамі аховы. У багажніках іншамарак знаходзілася 424 кг цукру-сырцу на суму больш як адзін мільён беларускіх рублёў. У дачыненні падазроных заведзена крымінальная справа па частцы 2 артыкула 205 Крымінальнага кодэкса — крадзеж, учынены групоўкай асоб.

Сяргей БУЙНОЎСКІ, начальнік Дэпартамента аховы МУС Беларусі, палкоўнік міліцыі:

Кампетэнтна

«АХОЎНАЯ ДЗЕЙНАСЦЬ: ЛІЦЭНЗАВАННЕ ПА-НОВАМУ»

1 верасня 2010 года Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь № 450 зацверджана Палажэнне «Аб ліцэнзаванні асобных відаў дзейнасці», у якім такому паняццю, як ахоўная дзейнасць, адведзены асобны раздзел. У адпаведнасці з новым дакументам, з 2011 года сур'ёзныя змяненні ўнесены ў парадак ліцэнзавання ахоўнай дзейнасці ў краіне. Паўнамоцтвы па падпісанні ліцэнзій на права ажыццяўлення ахоўнай дзейнасці дадзены начальніку Дэпартамента аховы Міністэрства ўнутраных спраў Беларусі. Некаторыя асаблівасці новага заканадаўчага акта пракаментаваў кіраўнік гэтага падраздзялення палкоўнік міліцыі Сяргей БУЙНОЎСКІ.

— Сяргей Аляксандравіч, якія істотныя змяненні адбыліся ў сферы ліцэнзавання ахоўнай дзейнасці?

— Па-першае, змянілася само найменне ліцэнзаванага намі віду дзейнасці. Цяпер ахоўнай дзейнасцю стала называцца тое, што раней характарызавалася як забеспячэнне бяспекі юрыдычных і фізічных асоб.

Па-другое, адбыўся падзел на ліцэнзаваную ахоўную дзейнасць і на неліцэнзаваную, на ажыццяўленне якой не патрэбна атрыманне спецыяльнага дазволу.

Па-трэцяе, тэрмін дзеяння ліцэнзій на ажыццяўленне ахоўнай дзейнасці павялічаны з 5 да 10 гадоў.

— У пералік работ і паслуг, што складаюць ахоўную дзейнасць, уваходзіць ахова юрыдычнай асобай прыналежнай ёй маёмасці на аб'ектах. Ці азначае гэта, што арганізацыі могуць сваю маёмасць ахоўваць толькі пры наяўнасці ліцэнзіі?

— Калі арганізацыя ажыццяўляе ахову прыналежнай ёй маёмасці, гэта значыць, рэалізуе дапаможныя работы па ахове рухомай і нерухомай маёмасці, то яна ў вызначаным законам парадку абавязана атрымаць ліцэнзію на гэта. Пры гэтым суіскальнік ліцэнзіі, які мае намер ажыццяўляць ахову прыналежных яму аб'ектаў, павінен валодаць правам уласнасці, гаспадарчага распараджэння, аператыўнага кіравання альбо іншым законным правам уладання або карыстання на гэтыя аб'екты і маёмасць.

— Ці пашырыўся пералік дакументаў, якія неабходна падаваць у ліцэнзуючы орган для атрымання ліцэнзіі?

— У адпаведнасці з прынятым палажэннем, з пераліку дакументаў выключаны копіі лакальных нарматыўных прававых актаў, што вызначаюць арганізацыю ліцэнзаванай дзейнасці. Але іх наяўнасць і выкананне з'яўляецца агульным ліцэнзійным патрабаваннем і ўмовай, што прад'яўляецца да ліцэнзіятаў.

— У вышэйзгаданым дакуменце прапісана паняцце «спецыялісты». Хто гэта такія і колькі іх павінна быць, каб арганізацыя магла ажыццяўляць ліцэнзаваную дзейнасць?

— Спецыялісты — гэта работнікі арганізацыі, якая хоча атрымаць ліцэнзію на ахоўную дзейнасць, для якіх гэта дзейнасць можа быць асноўным месцам працы. Спецыялісты павінны валодаць кваліфікацыяй, неабходнай у адпаведнасці з заканадаўствам для ажыццяўлення ліцэнзаванай дзейнасці. Абавязковым патрабаваннем і ўмовай, што прад'яўляецца да суіскальніка ліцэнзіі, з'яўляецца наяўнасць у штаце не менш як 3 спецыялістаў, што прайшлі ацэнку ведаў у вызначаным Міністэрствам унутраных спраў парадку.

— А што ўяўляе сабой ацэнка ведаў спецыялістаў, кім яна праводзіцца і якім нарматыўным актам рэгламентаваная?

— Ацэнку тэарэтычных ведаў спецыялістаў праводзіць камісія па ацэнцы ведаў спецыялістаў суіскальнікаў ліцэнзій (ліцэнзіятаў) Дэпартамента аховы МУС Рэспублікі Беларусь, абласных і Мінскага гарадскога ўпраўленняў дэпартамента, аддзелаў і аддзяленняў у райцэнтрах і гарадах, дзе дыслацыруюцца падраздзяленні Дэпартамента аховы. Ацэнка праводзіцца шляхам тэсціравання — пісьмова або з выкарыстаннем камп'ютарнай праграмы. А парадак правядзення ацэнкі ведаў спецыялістаў зацверджаны Пастановай МУС Рэспублікі Беларусь ад 20 снежня 2010 г. № 428.

— Як павінны класіфікавацца пасады работнікаў, якія ажыццяўляюць ахоўную дзейнасць?

— Згодна з артыкулам 19 Працоўнага кодэкса Рэспублікі Беларусь, найменне прафесій, пасад, спецыяльнасцяў павінна адпавядаць кваліфікацыйным даведнікам, якія зацверджаны ўрадам нашай краіны. Напрыклад, па Адзіным тарыфна-кваліфікацыйным даведніку работ і прафесій рабочых, ажыццяўляць ахоўную дзейнасць могуць прадстаўнікі такіх прафесій, як кантралёр на кантрольна-прапускным пункце, стралок і вартаўнік (вахцёр).

— У артыкуле 24 Закона «Аб ахоўнай дзейнасці ў Рэспубліцы Беларусь» гаворыцца, што «работнікі аховы выконваюць абавязкі пры наяўнасці службовых пасведчанняў і жэтонаў». Кім яны зацверджаны?

— Узоры службовых пасведчанняў і жэтонаў работнікаў аховы арганізацый, якія не валодаюць правам стварэння ваенізаванай аховы, устаноўлены Пастановай МУС Рэспублікі Беларусь № 404 ад 8 снежня 2010 г.

— У адпаведнасці з адным з пунктаў Указа № 450, юрыдычныя асобы абавязаныя да 1 сакавіка 2011 г. забяспечыць выкананне ліцэнзійных патрабаванняў і ўмоў і праінфармаваць пра гэта адпаведныя ліцэнзуючыя органы. Як гэта будзе адбывацца і хто праверыць дакладнасць інфармацыі?

— Структурнымі падраздзяленнямі Дэпартамента аховы ў зонах сваёй дыслакацыі ўжо накіраваныя пісьмовыя паведамленні ўсім дзейным ліцэнзіятам аб неабходнасці выканання падпункта 2.1.1. пункта 2 Указа № 450. Дакладнасць інфармацыі праверяць супрацоўнікі Дэпартамента аховы ў рамках рэалізацыі патрабаванняў Указа Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 16 кастрычніка 2009 г. № 510 «Аб удасканальванні кантрольнай (надглядная) дзейнасці ў Рэспубліцы Беларусь».

— Дзе суіскальнікі ліцэнзій і ліцэнзіяты могуць атрымаць больш падрабязную інфармацыю пра гэтыя новаўвядзенні і вывучыць тэмы для ацэнкі ведаў спецыялістаў?

— Усе нарматыўныя дакументы, што датычацца ажыццяўлення ахоўнай дзейнасці, і пералік тэм для ацэнкі ведаў размешчаны на афіцыйным сайце Дэпартамента аховы www.ohrana.gov.by ў інтэрнэце. Але лепш за ўсё па тлумачэнні і больш падрабязную кансультацыю звярнуцца ў тэрытарыяльнае падраздзяленне дэпартамента.

«Да абароны Айчыны гатовы!»

23 лютага ва ўсіх рэгіёнах краіны прайшла акцыя «Да абароны Айчыны гатовы!». Яна была арганізавана для вучнёўскай моладзі Беларускім рэспубліканскім саюзам моладзі і Беларускай рэспубліканскай піянерскай арганізацыяй пры падтрымцы Міністэрства адукацыі, МУС, МНС, Дзяржкамітэта пагранвойскаў. Арганізатары і выканаўцы праекта прапанавалі школьнікам і навучэнцам сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў дакрануцца да сапраўднай зброі і паспаборнічаць у веданні ўстройства аўтамата Калашнікава. Таксама сілавікі правялі майстар-класы па аказанні медыцынскай дапамогі, азнаёмілі дзяцей і падлеткаў з экіпіроўкай і тэхнічным забеспячэннем выратавальнікаў, міліцыянераў, вайскоўцаў.

Напрыклад, у сталіцы раённымі падраздзяленнямі Дэпартамента аховы ў рамках акцыі былі ахоплены тры навучальныя ўстановы: гімназія № 16 у Цэнтральным раёне, прафесійны ліцэй № 3 у Партызанскім раёне і СШ № 62 у Кастрычніцкім раёне. Дзецям прыносіць вялікае задавальненне прымераць на сябе бронекамізэльку і шлем, памацаць наручнікі і дубінку. На думку намесніка начальніка дэпартамента палкоўніка міліцыі Віталя Казлоўскага, «падобныя мерапрыемствы не проста нясуць забаўляльную функцыю, але і ствараюць станоўчы імідж прадстаўнікоў органаў унутраных спраў у падлеткавым разуменні адказнай і ганаровай місіі — служыць на карысць людзей».

«Прэм'ера» акцыі «Да абароны Айчыны гатовы!» адбылася яшчэ ў мінулым годзе, таксама 23 лютага. Яна мела шырокі станоўчы водгук як сярод школьнікаў, так і сярод іх настаўнікаў і бацькоў. У дзяцей выклікаюць буру станоўчых эмоцый візіты праваахоўнікаў, асабліва калі яны суправаджаюцца паказальнымі выступленнямі кінолагаў з сабакамі і расказамі бывалых міліцыянераў пра рэальныя факты раскрыцця злачынстваў. І ў гэты раз за ходам мерапрыемстваў з цікавасцю і ўдзячнасцю назіралі прадстаўнікі выканаўчай улады раёнаў Мінска, шэрагу іншых арганізацый.

Рэха афганскай вайны...

На базе Першамайскага (г. Віцебска) аддзела аховы цэнтрам культурна-выхаваўчай работы і аддзяленнем ідэалагічнай работы і падрыхтоўкі кадраў абласнога ўпраўлення аховы было арганізавана мерапрыемства, прысвечанае 22-й гадавіне выводу савецкіх войскаў з Афганістана.

У гэты дзень сабралася больш за 35 воінаў — ветэранаў афганскай вайны, якія служаць і працуюць у падраздзяленнях аховы г. Віцебска. Кожнаму з іх начальнік упраўлення Уладзімір Куракоў уручыў пісьмы-падзякі і грашовыя прэміі. Пасля на сцэну выйшлі з віншавальнымі музычнымі нумарамі Святлана Астапенка, Алена Літоўка і дзіцячы эстрадны ўзорны ансамбль «Ветразь».

***

Супрацоўнікі Дэпартамента аховы правялі шэраг мерапрыемстваў у памяць аб воінах-інтэрнацыяналістах. Начальнік аддзела ідэалагічнай работы маёр міліцыі Аляксандр Гуліс, абапіраючыся на відэахроніку, выступіў перад асабовым складам з аповедам пра тых, хто аддаў свае жыцці, ваюючы ў Афганістане. У апараце дэпартамента і сёння працуюць тыя, хто пабываў у «гарачых кропках». Падпалкоўнік міліцыі Маргарыта Марозава служыла санітаркай аперацыйна-перавязачнага ўзвода асобнай медыцынскай роты, палкоўнік міліцыі Уладзімір Хаванцаў камандаваў аддзяленнем разведвальнай роты, падпалкоўнік міліцыі Андрэй Амрэйчык быў стралком-памочнікам гранатамётчыка, а кіраўнік ветэранскай арганізацыі Мікалай Іваненка займаў пост ваеннага саветніка ў Эфіопіі.

Пасля калектыўнага віншавання сярод асабовага складу знайшлося нямала ахвотнікаў аддаць даніну павагі удзельнікам баявых дзеянняў. Дэлегацыя дэпартамента адправілася да мемарыяла воінам-інтэрнацыяналістам на Востраў мужнасці і смутку ў сталіцы, дзе ўзяла ўдзел у цырымоніі ўскладання вянкоў і кветак.

***

У Горацкім аддзеле Дэпартамента аховы МУС Рэспублікі Беларусі адбылася вечарына, на якой ушаноўвалі ўдзельнікаў вайны ў Афганістане. Супрацоўнікі аховы, якія бралі ўдзел у афганскай вайне, узнагароджаны лістамі падзякі і грашовымі прэміямі. Гэта, напрыклад, прапаршчык міліцыі Горацкага аддзела аховы Уладзімір Аксёнаў, вартаўнік падраздзялення Сяргей Аляксееў і маёр міліцыі ў адстаўцы Леанід Смалякоў.

— Гэта была чужая вайна для нас, — з такімі словамі звярнуўся да ветэранаў вайны ў Афганістане **намеснік начальніка Магілёўскага абласнога ўпраўлення аховы Міхаіл САМУСЕЎ.** — У ёй не магло быць перамогі, і яна працягваецца цяпер без нас. Але не забудуцца на гэтую вайну тыя, хто там ваяваў і твар у твар сутыкнуўся са смерцю. Гэтыя салдаты і афіцэры з гонарам выканалі свой доўг і з'яўляюцца для нас прыкладам і ўзорам. Мы не маем права забыцца на іх.

Веды спатрэбіліся «ў баі»

24 лютага ў Магілёўскім вышэйшым каледжы МУС адбылася рэспубліканская акцыя Міністэрства ўнутраных спраў «Гонар і доблесць». У намінацыі «За бескампрамісную барацьбу з крыміналам не дзеля асабістай славы, дзеля жыцця на зямлі» Дэпартамент аховы прадставіў міліцыянер Бабруйскага аддзела аховы старшы сяржант міліцыі Дзмітрый БАБРОЎ.

Дзмітрый марыў стаць міліцыянерам з дзяцінства. Закончыўшы 11 класаў сярэдняй школы на «добра» і «выдатна», быў прызваны на тэрміновую службу. У арміі ўзмужнеў і яшчэ больш зацвердзіўся ў жаданні служыць сваёй краіне і людзям. З добрай армейскай характарыстыкай пасля дэмабілізацыі Дзмітрый быў залічаны ў вучэбны цэнтр Дэпартамента аховы. Пасля навучання быў прыняты на службу ў аддзел аховы.

Дзмітрый з усёй адказнасцю падыходзіць і да выканання службовых абавязкаў, і да ўдасканальвання тэарэтычнай і фізічнай падрыхтоўкі. І недарэмна, паколькі аднойчы атрыманыя веды спатрэбіліся, так бы мовіць, у «баі». У Бабруйску адбылася серыя крадзяжоў асабістай маёмасці з дамоў грамадзян. Ноччу, пры правядзенні рэйдавых мерапрыемстваў па папярэджанні і раскрыцці крадзяжоў з прыватных домаўладанняў, Дзмітрый звярнуў увагу на мужчыну, які па прыкметах быў падобны на асобу, што вышукваецца па падазрэнні ў гэтых злачынствах. Супрацоўнік назваўся, паказаў службовае пасведчанне і папрасіў прад'явіць дакументы. Мужчына дастаў нож і пачаў ім размахваць, набліжаючыся да міліцыянера. Баброў павёў сябе граматна: зрабіўшы некалькі крокаў назад, ён запатрабаваў спыніць супрацьпраўныя дзеянні, аднак зламыснік не падпарадкаваўся. Тады Баброў дастаў табельную зброю, прывёў яе ў баявую гатоўнасць і папярэдзіў нападніка аб магчымасці яе выкарыстання. Зламыснік працягваў набліжацца да вартавога правапарадку, таму супрацоўнік зрабіў папераджальны стрэл угору. Мужчына стаў уцякаць, але, бачачы, што за ім гоняцца, спыніўся і зноў пачаў пагражаць міліцыянеру нажом. Пасля паўторнага патрабавання спыніць супрацьпраўныя дзеянні і папярэджання аб магчымасці прымянення зброі, супрацоўнік зрабіў другі папераджальны стрэл уверх. Гэта толькі завяло падазронага, і ён напаў на міліцыянера. Дзмітрыю нічога не заставалася, акрамя як зрабіць прыцэльны стрэл у нагу. Параніўшы правапарушальніка, пасля непрацяглай схваткі Дзмітрый Баброў затрымаў яго. Пры разборы высветлілася, што затрыманы мае дачыненне больш чым да двух дзясяткаў крадзяжоў з жылля бабруйчан.

За праяўленую прафесійную ініцыятыву і забеспячэнне высокай эфектыўнасці працы старшы сяржант міліцыі Баброў Д.А. быў узнагароджаны Граматай Міністэрства ўнутраных спраў Рэспублікі Беларусь.

Душа фінансаў брэсцкай аховы

Пра старшага лейтэнанта міліцыі ў запасе — галоўнага бухгалтара Брэсцкага аблупраўлення аховы Веру ХВАРАГІНУ — кіраўніцтва без перабольшвання і ліслівасці адзываецца як пра разумную, абаяльную, працавітую, ініцыятыўную і чулую жанчыну, а таксама паспяховага і мэтанакіраванага прафесіянала.

У міліцыю Вера Міхайлаўна прыйшла ў красавіку 1977 года. Яна заўсёды марыла прымерыць пагоны, адчула, што гэта прафесія для яе. Таму і закончыла Разанскую вышэйшую школу МУС СССР. Службовыя будні Веры пачаліся на пасадзе бухгалтара-рэвізора УУС Брэсцкага аблвыканкама, але праз 7 гадоў яна перайшла на пасаду намесніка галоўнага бухгалтара пазаведамаснай аховы рэгіёна, дзе і засталася на дваццаць з лішнім гадоў.

Яе шматгадовая карпатлівая праца штодзень падмацоўваецца добрымі і цёплымі зносінамі ў калектыве. Аб працавітасці Веры Хварагінай ведаюць усе, але працаголікам яна сябе не лічыць, знаходзіць час для родных і блізкіх людзей. Сям'я ўсяляк падтрымлівае і разумее Веру Міхайлаўну, бо двое сыноў таксама працуюць у органах унутраных спраў.

Паколькі асноўную частку часу чалавек праводзіць на працы, міжасобасныя стасункі ў калектыве павінны заўсёды настройваць на добры лад. Менавіта такога прынцыпу прытрымліваецца Хварагіна. Яна далікатная ў зносінах і не прызнае павышанага тону з чыйго-небудзь боку, паважліва ставіцца да кожнага, бачачы ў чалавеку перш за ўсё асобу. У любой складанай або пазаштатнай сітуацыі Вера Міхайлаўна, так бы мовіць, заўсёды падыходзіць да вырашэння пытання з «халоднай галавой»: усё ўспрымае спакойна і пра памылкі супрацоўнікаў гаворыць карэктна, заўсёды знаходзячы кампраміс.

Пра свой лёс гаворыць з усмешкай і не шкадуе ні аб адным зробленым учынку і пражытым дні.

Матэрыялы падрыхтавалі Уладзімір ЗДАНОВІЧ, Аляксандр ГЕРАСІМАЎ, Алена ЯРМАЛІНСКАЯ, Ілона ІВАНОВА, Яўген ТАЛАЙ, Наталля ЛЕРНАТОВІЧ, Вольга КІПЧАНКА, Андрэй НОВІК.

Ведай нашых!

ВЫСТУПІЛІ ГОДНА!

16—17 лютага ў сталічным Палацы спорту адбыўся этап Кубка свету «XV Адкрыты чэмпіянат Рэспублікі Беларусь па самба на прыз Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь». Спартыўны форум сабраў больш за 170 лепшых самбістаў з 19 краін блізкага і далёкага замежжа. Атлеты змагаліся на 4 дываванах у 9 вагавых катэгорыях. Адметна, што ў 2-х катэгорыях нацыянальную зборную краіны прадстаўлялі супрацоўнікі Дэпартамента аховы МУС, і выступілі яны вельмі годна. У вазе да 57 кг курсант Вучэбнага цэнтра дэпартамента радавы міліцыі Іван Аніскевіч (на фота — злева) заваяваў 2-е месца, нязначна саступіўшы вопытнаму атлету з Грузіі. У вазе да 62 кг курсант той жа ўстановы радавы міліцыі Руслан Намазаў) адстаяў серабро ў вельмі тытулаванага барца-беларуса. Сваім выступленнем ахоўнікі не толькі паказалі высокія вынікі, але і заслужылі права прадстаўляць у 2011 годзе нацыянальную зборную на ўсіх афіцыйных міжнародных турнірах па самба, у тым ліку чэмпіянатах Еўропы і свету.



Свята спорту, зімы і добрага настрою

10 лютага Вучэбны цэнтр Дэпартамента аховы расчыніў свае дзверы для сустрэчы вялікай колькасці гасцей. У марозны суботні дзень вучэбная база аховы ператварылася ў спартыўную пляцоўку для супрацоўнікаў Міністэрства ўнутраных спраў.

Мароз не перашкодзіў, і настрой ва ўсіх быў на вышыні, бо культурна-забаўляльная і спартыўная праграма мерапрыемства абяцала быць насычанай. Асноўнымі этапамі спартыўных спаборніцтваў былі лыжная гонка сярод кіраўнікоў, эстафета «Біятлон», комплексная эстафета і перацягванне каната. Тыя ж, хто не ўвайшоў у склад каманд асноўных спаборніцтваў, змаглі праверыць свае сілы ў іншых конкурсах: распілоўка бервяна на хуткасць, трапнасць стральбы з пнеўматычнай зброі, лука і дакладнасць у дартсе, скачкі са скакалкай, рывок гіры.

Пасля прывітальнага слова намесніка міністра ўнутраных спраў палкоўніка міліцыі Анатоля Курыльца быў дадзены старт спаборніцтвам.



Ужо праз непрацяглы час у «скарбонцы» каманды аховы з'явіўся першы дастойны вынік — намеснік начальніка дэпартамента палкоўнік міліцыі Віталь Казлоўскі заняў трэцяе месца ў лыжнай гонцы сярод кіраўнікоў. Марафон прадоўжылі ўдзельнікі эстафеты «Біятлон», у якой за перамогу «змагаліся» тры мужчыны і адна жанчына ў кожнай камандзе. Сярод чатырнаццаці калектываў ва ўпартай барацьбе ахоўнікам удалося заваяваць першае месца. Таксама першае месца заняў начальнік аддзялення прафпадрыхтоўкі падпалкоўнік Пётр Грынкевіч, штурхнуўшы больш за ўсіх 24-кілаграмовую гіру. Комплексная эстафета ўключала ў сябе дзевяць этапаў. Мужчына на адной лыжы павінен быў абагнуць пілоны, а за ім тое ж самае павінна была зрабіць жанчына. Наступная пара адольвала дыстанцыю пры дапамозе санак, следам за імі бегла жанчына з клюшкай і тэнісным мячом, пасля — мужчына ў мяшку, жанчына з футбольным мячом, пара ў абручы. Завяршала эстафету дзіця, якое аббягала пілоны з бадмінтоннай ракетка і мячом. У выніку гэтай «спрынтарскай гонкі» каманда аховы заваявала ганаровае трэцяе месца.

Дзень аказаўся багатым на перамогі і добры настрой. Супрацоўнікі аховы, што ўзялі ўдзел у арганізацыі гэтага мерапрыемства, пастараліся ўлічыць усе пажаданні гасцей: тым, хто замерз і прагаладаўся, прапанавалі гарачую гарбату, бліны і кашу з палявой кухні. Усе, хто ўзяў з сабой дзяцей, маглі не хвалявацца за іх: у аўдыторыях вучэбнага цэнтра дзеці змаглі адагрэцца і пагуляць у камп'ютарныя гульні. Аматары прыроды і спакойнага адпачынку атрымалі задавальненне ад прагулкі на санях і падыхалі свежым лясным паветрам.